# Яшчэ адзін медаль на рахунку РУП «Белпошта»

Сёння, 15 лютага першы намеснік Міністра сувязі і інфарматызацыі Дзмітрый Шэдко ўрачыста ўручыў генеральнаму дырэктару РУП «Белпошта» Уладзіміру Матусевічу міжнародны сертыфікат Сусветнага паштовага саюза.

Беларуская пошта з мэтай пашырэння рэкламы беларускіх паштовых марак удзельнічае ў міжнародных філатэлістычных конкурсах. У лістападзе 2016 г. была распрацавана і адпраўлена экспазіцыя беларускіх паштовых марак для ўдзелу ў 14-м міжнародным конкурсным класе, які адбыўся ў г. Наньнін (КНР) з нагоды Азіяцкай міжнароднай філатэлістычнай выставы «CHINA 2016» (02-06.12.2016 г.) . У дадзеным міжнародным конкурсе маглі ўдзельнічаць паштовыя арганізацыі краін - членаў СПС і тэрыторый, якія толькі далучыліся да сістэмы нумарацыі WNS выпускаюць маркі.

Беларуская экспазіцыя была прадстаўлена ў групе В (краіны, якія выпускаюць 30-69 паштовых марак у год). Экспазіцыя складалася з філатэлістычнай прадукцыі (прадукцыя, прызначаная для перасылкі пісьмовай карэспандэнцыі або іншых паштовых адпраўленняў), выпушчанай на працягу трох гадоў да 1 студзеня 2016, г.зн. паштовая прадукцыя 2013, 2014 і 2015 г.

Аднымі з галоўных крытэрыяў ацэнкі экспазіцыі сталі:
• выкарыстанне поштай намінальнага кошту (нацыянальная і міжнародная карэспандэнцыя);
• арыгінальнасць і якасць прэзентацыі;
• тэхнічная якасць прадстаўляемай філатэлістычнай прадукцыі (спосаб друку, форма, арыгінальнасць, творчы падыход і г.д.).

Экспазіцыі РУП «Белпошта» у групе В прысуджаны сярэбраны медаль. Дадзеная ўзнагарода з'яўляецца высокай ацэнкай якасці беларускай філатэлістычнай прадукцыі на міжнародным рынку і дэманструе прафесіяналізм у падрыхтоўцы паштовай экспазіцыі.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/15-02-2017-1650*